# Школьная планета

**НЕ БУДЗЬ ЧУЖЫНЦАМ НА САВЁЙ ПЛАНЕЦЕ!**

**№ 2 (40) КАСТРЫЧНІК 2017**

*Выданне ДУА "Сярэдняя школа № 2 горада Беразіно" Мінскай вобласці*

## Кастрычнік

*Даждлівае надвор'е,*
*Кастрычніцкая слота.*
*Дождж-імжака,*
*дождж-свавольнік*
*Ахінуў сабою горад,*
*Лісце жоўтае каштанаў*
*На траве пажухлай мокне...*
*А здаецца - нібы сонца*
*Раскідала аскалёпкі.*

*Юрась Півуноў*




**Фота Паліны Маркевіч**




## Настаўніку

*Стаяць ля маладых гадоў,*
*Ля чалавечага дзяцінства —*
*Вялікі гонар, светлы доўг*
*Настаўніцтва і мацярынства.*
*Спачатку ў сэрцах прабудзі*
*Цягу і смагу да асветы,*
*Пасля — задуманых вядзі*
*Аж да крыніцы чыстай, светлай.*
*На ростані шляхоў-дарог,*
*Абвеяных паходным пылам,*
*Народ навекі нам збярог*
*Крыніцу мудрасці і сілы.*
*Ты чэрпаць навучы з глыбінь*
*Жывучую ваду рукою,*
*Каб наш народ і край любіць,*
*Мудрэць і харашэць душою.*

*Валянцін Таўлай*






*Дзень беларускага пісьменства — дзяржаўнае свята ў Рэспубліцы Беларусь, якое адзначаецца з 1994 года ў першую нядзелю верасня. Штогод свята ладзіцца ў новых гарадах з багатай гістарычнай спадчынай, даўніх цэнтрах асветы, культуры і кнігадрукавання.*

*Дзень беларускага пісьменства 2017 года асаблівы, паколькі беларусы адзначаюць 500-годдзе беларускага кнігадрукавання і 1155-годдзе горада Полацка.*

*Полацк прымаў Дзень беларускага пісьменства ўжо трэці раз. Знакавыя падзеі сталі вызначальнымі ў выбары месца правядзення мерапрыемства.*

# Шуміць Скарынаўскае свята

***Шуміць Скарынаўскае свята,***
***Спявае ў сэрцах палачан,***
***І грае музыка заўзята,***
***І б'е вясёлкамі фантан.***
***Скарына! Кніг яго крылатых***
***Святло нам ззяе праз вякі.***
***Ён сеяў мудрасці зярняты,***
***Каб свет пазналі землякі.***
***Вучэння залажыў асновы,***
***Як трэба веды здабываць.***
***На беларускай роднай мове***
***Жадаў ён з намі размаўляць.***
***Вучыў: як птушкі ўсе адвеку***
***Да родных гнёздаў зноў ляцяць,***
***Так без Радзімы чалавеку***
***Няма ні шчасця, ні жыцця.***
***Табе мы рады пакланіцца,***
***Скарына, сэрцаў валадар,***
***За кніжак вечную крыніцу,***
***За гэты твой цудоўны дар.***
***Ты шлях праклаў нам да навукі,***
***Не пахіснуўся ў барацьбе…***
***Мы верым: прынясуць і ўнукі***
***Усе кветкі верасня табе.***

*Надзея Ярмак*










*Сучаснае слова* ***ВЕРАСЕНЬ*** *паходзіць ад* ***“верас”*** *(менавіта ў гэты час расліна пачынае красаваць). У верасні неспрыяльныя ўмовы надвор’я: частыя дажджы, раннія замаразкі, вялікія вятры. Таму сяляне стараюцца ўбраць бульбу, гародніну і садавіну.*



*Дрэвы мяняюць сваю афарбоўку на чырвоную, карычневую, пунсовую і жоўтую. Шматгадовыя назіранні за звялай прыродай і паводзінамі жывёл адлюстраваны ў мудрых народных прыкметах. Плятуць свае красёнцы павукі ў паўднёвым напрамку – пацяплее, а ў паўночным – пахаладае. Воблакі цягнуцца з поўначы на поўдзень – на сонечнае надвор’е, а наадварот – чакай непагадзь. Туманы на зямлю прылягаюць – пацяплее хутка.*

***Матэрыял падрыхтавала Паліна Сямашка***

## РЫХТУЕМСЯ ДА АЛІМПІЯДЫ

***Алімпіяда - заўсёды псіхалагічнае напружанне, стрэс. І гэта нармальная рэакцыя арганізма. Лёгкія эмацыйныя ўсплёскі карысныя, яны станоўча адбіваюцца на працаздольнасці і ўзмацняюць разумовую дзейнасць. Але эмацыйнае перанапружанне часцяком аказвае адваротнае дзеянне.***

### Парады ўдзельнікам алімпіяд

*Трэба ставіць перад сабой мэту, якая вам па сілах. Не варта баяцца памылак. Вядома, што не памыляецца той, хто нічога не робіць.*

*Неабходна загадзя азнаёміцца з правіламі і працэдурай алімпіяды, гэта здыме эфект нечаканасці.*

*Пачынай рыхтавацца да алімпіяды загадзя, патроху, па частках, захоўваючы спакой.*

*Калі вельмі цяжка сабрацца з думкамі, пастарайся запомніць спачатку самае лёгкае, а потым пераходзь да вывучэння цяжкага матэрыялу.*

*Падрыхтоўка да алімпіяды патрабуе досыць шмат часу, але яна не павінна займаць абсалютна ўвесь час. Апошнія 24 гадзіны павінны пайсці на падрыхтоўку арганізма, а не ведаў. Увага і канцэнтрацыя слабеюць, калі доўга займацца аднастайнай працай. Змяняйце разумовую дзейнасць на рухальную. Аптымальна рабіць 10-15 хвілінныя перапынкі пасля 40-50 хвілін заняткаў.*

*Харчаванне павінна быць 3-4разовым, каларыйны і багатым вітамінамі. Ужываце ў ежу грэцкія арэхі, малочныя прадукты, рыбу, мяса, гародніну, садавіну, шакалад, больш карысна піць простую ці мінеральную ваду, зялёны чай, але нельга пераядаць. Выконвайце рэжым сну і адпачынку.*






## Восеньскі кірмаш



***“Кірмаш у школу завітай, восень дары нам свае прынесла!”*** – пад такім дэвізам прайшло суботняе школьнае свята.

*І сапраўды, восеньская цёплая раніца прынесла да нас нябачны ўраджай, сабраўшы пад дахам школы дзяўчынак і хлопчыкаў, тат і мам, бабуль і дзядуль, настаўнікаў і проста выпадковых гасцей, якія сталі сведкамі і непасрэднымі ўдзельнікамі кірмашу.*



*Ад асартыменту разбягаліся вочы! Прадавалі прысмакі за невялікі кошт, бо грошы былі тут зусім ні пры чым, хутчэй, усё было арганізавана дзеля душы. Школьны кірмаш прынёс шмат незабыўнага. Дзеці і дарослыя з задавальненнем прадавалі і куплялі, жартавалі і радаваліся.*

*Вялікі вам дзякуй за небывалыя эмоцыі і … смачныя пачастункі.*

***Паліна Сямашка***
***Фота Ірыны Маркевіч***

## 14 кастрычніка – Дзень маці.
## А як ты павіншаваў сваю матулю?




*Лапцёнак Марына, 8 “Б” клас*
*Купіла ў падарунак кружку і павіншавала*



*Бубенька Кацярына, 8 “А” клас*
*Падарыла прыгожае плацце*



*Філіповіч Кацярына, 9 “Б” клас*
*Павіншавала тортам і букетам кветак*



*Жукоўская Ганна, 10 “Б” клас*
*Павіншавала на словах, падарыла кветкі і цукеркі*

***Апытванне праводзіла Валерыя Усачова.***
***Фота ўзята з сацыяльных сетак.***



# *Дом, у якім утульна ўсім!*

**berezino2.school.by vk.com/club59543714 *№ 40, кастрычнік 2017 г.***







*Вучняў **VII-VIII класаў** школ і гімназій Рэспублікі Беларусь запрашаюць да ўдзелу **ў рэспубліканскім конкурсе “Чытаем па-беларуску з velcom”**, якія пачнецца **11 кастрычніка 2017 года**. Праект праводзіцца пры падтрымцы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.*

## ***Падрабязны алгарытм удзельніцтва ў конкурсе***

**1.** Удзельнік конкурсу *выбірае твор з вучэбнай праграмы* па прадмеце “Беларуская літаратура” (верш, проза, урывак твора).

**2.** Вучань *запісвае відэазапіс*, на якім чытае выбраны твор. Падчас выканання твора можна выкарыстоўваць дадатковую атрыбутыку, рэквізіт, касцюм, музычнае суправаджэнне. Дазваляецца выкарыстанне відэамантажу.

**3.** *Відэазапіс удзельніка павінен пачынацца* з прадстаўлення (імя, прозвішча, горад, назва навучальнай установы, клас).

**4.** *Працягласць відэазапісу не павінна перавышаць 2 хвілін.*

**5.** Удзельнік конкурсу *размяшчае відэазапіс на сваёй асабістай старонцы ў сацыяльнай сетцы* (vk, facebook, або instagram). Старонка ў сацыяльнай сетцы павінна быць адкрытай для прагляду другімі карыстальнікамі.

**6.** Удзельнік конкурсу павінен *суправадзіць публікацыю з відэазапісам адным з афіцыйных хэштэгаў* конкурсу – **#чытаемзвэлком** альбо **#чытаемзvelcom**.

**7.** Пасля публікацыі відэазапісу ў сацыяльнай сетцы, удзельнік павінен *выслаць гіперспасылку на публікацыю* на афіцыйную пошту праекта – movakonkurs@gmail.com.

**8.** Удзельнік можа заявіць на конкурс *не больш за 2 відэазапісы.*

**9.** Відэазапісы ад удзельнікаў прымаюцца *да 30 лістапада ўключна.*




*__КАСТРЫЧНІК.__ Беларускае найменне месяца паходзіць ад слова "кастрыца": у гэты час сяляне трапалі, часалі лён і каноплі, з якіх ападала шмат кастрыцы.У рымлян october (такая ж аснова ў нямецкай, французскай, англійскай, рускай мовах) быў прысвечаны богу вайны Марсу. Старажытныя грэкі ўшаноўвалі бога вінаробства Бахуса (Дыяніса).*



*Кастрычнік – сярэдні месяц восені, характарызуецца зменлівым надвор`ем: бываюць густыя туманы, слата, частыя замаразкі, а часам выпадае і снег. Дрэвы стаяць аголеныя, птушкі адляцелі ў вырай. Наступае пара для садаводаў: пасадка дрэў і ягаднікаў, абмазванне ствалоў глінай і вапнай, іх уцяпленне. Асноўнае свята – __Пакровы.__ У скарбніцы сялянскай мудрасці маюцца прыкметы, па якіх вызначаецца надвор`е як на бліжэйшыя дні, так і на вялікі тэрмін – зіму і вясну.*

***Матэрыял падрыхтавала Паліна Сямашка***

**Дом, у якім утульна ўсім!**

**berezino2.school.by vk.com/club59543714** ***№ 40, кастрычнік 2017 г.***

# Ці любіце вы чытаць кнігі?

*Для некаторых людзей кнігі - гэта не проста набор знакаў, гэта цэлы свет. Не так даўно мы правялі невялікае сацыяльнае апытванне. Настаўнікі і вучні адказвалі на наступныя пытанні:*

1. ***Ці любіш ты чытаць?***
2. ***Якім жанрам літаратуры ты аддаеш перавагу?***
3. ***Любімы літаратурны герой.***
4. ***Любімая кніга.***



*І вось якія адказы мы пачулі.*



*Алікевіч Ілья,*
*10 “Б” клас*

1. *Да, люблю.*
2. *Ваенная тэматыка.*
3. –
4. *“А досвіткі тут ціхія”, Барыс Васільеў.*



*Гурэнчык Ксенія,*
*выпускніца школы*

1. *Я вельмі люблю чытаць.*
2. *Навуковая фантастыка, дэтэктывы.*
3. –
4. *“Кніжны злодзей”, Маркус Зусак.*



*Бяздольнік Уладзіслаў,*
*10 “А” клас*

1. *Так, я люблю чытаць.*
2. *Мастацкая літаратура.*
3. *Рамэа.*
4. *“А досвіткі тут ціхія”, Барыс Васільеў.*



*Губіч Галіна Міхайлаўна,*
*настаўнік прац. Навуч.*

1. *Раней шмат чытала, была ў таварыстве кнігалюбаў.*
2. *У школьныя гады любіла фантастыку, а зараз – дэтэктывы.*
3. –
4. *“Ледзяны дом”, Іван Лажэчнікаў*



*Усачова Валерыя,*
*8 “Б” клас*

1. *Я чытаю, калі ёсць вольны час.*
2. *Прыгодніцкія.*
3. –
4. *“Гары Потэр”, Джоан Роўлінг*



*Нярода Ева,*
*былая вучаніца школы*

1. *Я шмат чытаю, у мяне ўласная бібліятэка.*
2. *Фантастыка.*
3. *Маленькі прынц.*
4. *“Гары Потэр”, Дж. Роўлінг. “Маленькі прынц”, Антуан дэ Сэнт-Экзюпеcurl.*

***Апытванне праводзіла Паліна Маркевіч.***

***Фота ўзята з сацыяльных сетак.***



# *Я выбіраю спорт!!!*















# РЫХТУЕМСЯ ДА АЛІМПІЯДЫ

## Як паводзіць сябе падчас алімпіяды?

Перад алімпіядай абавязкова добра паспі.

Вопратку, пісьмовыя прыналежнасці, «талісман» – падрыхтуй загадзя, у дзень перад алімпіядай. З сабой абавязкова павінны быць: мінімум 2 ручкі, аловак, тачылка, гумка. Адзенне павінна быць спакойных таноў.

За дзень да алімпіяды пастарайся нічога не вучыць. Калі штосьці недавучыў, лепш не спрабуй. Дай адпачыць арганізму.

Слухай выкладчыка ўважліва, каб ў далейшым не задаваць лішніх пытанняў.

Не спяшайся! Чытай заданне да канца. Спешка не павінна прыводзіць да таго, што ты зразумееш заданне па першых словах, а канцоўку прыдумаеш сам. Але памятай, што час рэгламентаваны, а табе трэба зрабіць заданні і запоўніць бланк.

Праглядзі ўсе пытанні і пачні з тых, у адказах якіх ты не сумняваешся. Тады ты супакоішся і ўвойдзеш у працоўны рытм.

Дзейнічай метадам выключэння! Паслядоўна выключай тыя адказы, якія відавочна не падыходзяць.

Калі ты сумняваешся ў правільнасці адказу, табе складана зрабіць выбар. Даверся інтуіцыі!

Пакінь час для праверкі сваёй работы, хаця б для таго, каб паспець прабегчы вачыма і заўважыць яўныя памылкі.




ДУА “Сярэдняя школа № 2 горада Беразіно”
223311
вул. Мультана, 19
Электронная пошта
berezinosch2.edu@tut.by
Сайт школы
berezino2.school.by

Газета “Школьная планета” выходзіць адзін раз у месяц.
Творчы калектыў клуба “Юны журналіст”: Дудко Аляксандра, Жук Вольга, Вайцяховіч Лізавета, Власюк Марыя, Маркевіч Ірына, Сямашка Паліна